Алесь Камоцкі

Забірай маё лета

Мінск
2017

Камоцкі, А.В.
Забірай маё лета: вершы / Алесь Камоцкі;
фота. Вадзім Грудзько. — Мінск, 2017. — 94 с.: фат.

Кнігу вершаў Алеся Камоцкага, напісаных у 2012-14 г.г., аздобіў фотаздымкамі Вадзім Грудзько.

Алесь
Камоцкі

Забірай маё лета



Я ведаю, што там, дзе заўтра будзе дзень,
Учора не знайшлі ні нас, ні нашых думак.
І вечар цішынёй у вочы не глядзеў,
І мроя не была ні добрай, ні разумнай.

Браў вецер за руку дзіцячую душу.
Я бачыў – іх сьляды глыталі кіламетры.
Тлумачыць кожны крок душу не папрашу –
Няхай сабе ідуць, я давяраю ветру.

Вяртаньнем назаўжды ня вырашыць праблему,
Памкненьню не знайсьці ні месца, ні спакою,
Чаканьне сапраўды хацела мець ня тое,
Чым можа быць жыцьцё, калі мяняе тэму.

Я ведаю, што ты на заўтра не зважаеш,
Смакуючы фінал; я ж мару пра працяг,
Пра гэту далячынь, што быццам не чужая,
Але і не мая, бо я тут у гасьцях.

Якою дарогай патрапіць у рай –
Пытаньне шукае адказ.
Мы толькі зьбіраліся шлях выбіраць,
Калі ён ужо выбраў нас.

Займае дыханьне, і словы маўчаць,
У марах суцэльны разлад,
Ня хочацца верыць упартым вачам,
Што гэта дарога назад.

І кожны там быў, ды ня кожны пасьпеў
У самым звычайным жыцьці
Убачыць ня тое, што бачыць прасьцей,
А тое, што варта знайсьці.

Якою дарогай вяртацца назад,
За межы бягучага дня?
Спыняецца час, каб усім паказаць,
Што тут яна толькі адна.

Дарога назад – гэта сон і падман,
Дзе дзівам прыпынены час,
Свой наканаваны зьдзяйсьняючы план,
Жыцьцю прапаноўвае нас.

Займае дыханьне і словы маўчаць,
У мары зьмяняецца смак,
Здаецца, што можна яшчэ раз пачаць,
Мы толькі ня ведаем як.



Далёка-далёка дзіцячыя сны,
Іх памяць надзейна умеюць хаваць
Межы галоўных пытаньняў зямных,
Дзе кожнаму сьніцца дарога свая.

Мы чуем і бачым па-іншаму зараз,
За часам, што лёсы у рэкі зьлівае –
Адбіткі дзіцячых нязьдзейсьненых мараў
Зьвіняць ва ўсьмешках дарослых вачэй.

Дарослыя крокі блукаюць навокал.
Шукаючы выйсця, знаходзяць дарогу,
Знайшоўшы дарогу, зьнікаюць патроху
Шэрым туманам былога жыцьця.

Далёка-далёка нябесныя сны
Нястомная памяць умее схаваць.
У межах галоўных пытаньняў зямных
Ня кожнаму дасца дарога свая.



Чые далоні затрымаюць вецер?...
Ня псуй пытаньне пошукам адказу,
А лепш сама, як вецер, непрыкметна
Ляці кудысьці,
Толькі не адразу,
А пакружляй спачатку няўлоўна
Вядомымі адной табе кругамі,
Спарадкуй дзеля будучага памяць,
І не спрабуй пакуль што асэнсоўваць
Мае пытаньні.

Цёмна-шэрая ноч па халоднай зямлі
Чорным сэнсам і шчырым намёкам
Безьліч лёсаў нікчэмных пасьпела разьліць
Пад усьмешкамі сонных аблокаў.

І дарогу на захад шукае ўсход,
І спрадвечную песьню губляе,
А пасьля нерашуча маўчыць ля варот,
За якімі ні пекла, ні рая.

Выпіла песьню маю
Далеч бясконцых дарог,
Думкі вялі за парог,
Голас сьпяваў, покуль мог,
Даўнюю песьню маю.

І прыходзіць пара стаць каля алтара,
Ськіраваўшы да сонца малітву,
І стаяць, покуль свечы ушчэнт не згараць,
І на простых працяг не разьлічваць.

Ці ж падманеш пачатак чарговага дня,
Перакрыўшы сьвятло занавескай?
Пасівелую ноч бессэнсоўна спыняць,
Бо яе зачакалася вечнасьць.

Выпіла песьню маю
Далеч бясконцых дарог,
Думкі вялі за парог,
Голас сьпяваў, покуль мог,
Даўнюю песьню маю.

Ліст залаты
Лета ня помніць,
Вось і цяпла
Ўжо не стае.
Так, як заўсёды,
Так, як ад веку,
Восень наводзіць
Парадкі свае.

Ўсё, што вясна
Распачынала,
Змогуць дажджы
Змыць да зімы.
Так, як заўсёды,
Так, як адвеку,
Што будзе з марай –
Ня ведаем мы.

Цемрай глядзіць
Заўтрашні ранак,
Зноў мы жывём
Праўдай адной.
Так, як заўсёды,
Так, як адвеку,
Цемра загіне
Наступнай вясной.




Зімовы вечар апускае мне на плечы
Сівы туман раптоўнай сьнежаньскай адлігі,
А незваротны час зьнікае непрыкметна
І не зважае на пачуцьці і ўздыхі.

Гады лятуць, пакуль гадзін ніхто ня лічыць,
І, без увагі пакідаючы хвіліны,
Каму заўгодна я мінулае пазычу,
Каб толькі вырвацца з палону ўспамінаў.

Я буду заўтра забываць сваё ўчора,
Таму, што сёньня дзень заняты іншай справай.
Сьлядамі часу запаўняецца прастора –
Ня будзе крокам болей шляху неўзабаве.

Зімовы вечар апускае мне на плечы
Сівы туман раптоўнай лютаўскай адлігі...



Шэрым днём мінула восень,
Белым сном прыйшла зіма.
Лічыць час, што гэта проста –
Дні складаць і адымаць.

Не спыніць і не прысьпешыць –
Ён такі ва ўсе вякі –
І пакрыўдзіць, і суцешыць,
І прыпомніць – ён такі!



Лагодным ліпеньскім дажджом
Вясёлку з неба змыла лета.
Жыцьцё маё ішло дагэтуль
Не пакідаючы сьлядоў.

Ішло жыцьцё маё пакуль
Не разьбіраючы дарогі,
Ішло таму, што несьлі ногі
Не да таго, хто крокі чуў.

Лагодным ліпеньскім дажджом
Вясёлку з неба змыла лета,
Мне паказаў напрамак вецер,
А я дарогу не знайшоў.



Паводле "Besame mucho"
Кансуэлы Веласкес

Раніца, смак пацалунка –
Помніш, як гэта калісьці было ўпершыню?
Хочацца заўтра прачнуцца
І, як учора, у вочы табе зазірнуць.

Памяць і мроя паціху яднаюцца,
Мары знаходзяць спакой,
Новыя дні як заўжды пачынаюцца,
Але ўжо не з табой.

На матыў "Прощание славянки"
В. Агапкіна

Гукі марша бязьлітасным сумам
Разрываюць душу на шматкі.
Ці ж маглі мы учора падумаць,
Што жыцьцё наша будзе такім?
Што сустрэнемся, каб разьвітацца,
Што ізноў будзеш ты не мая,
Што адвеку нягеглае шчасьце
Нам у рукі ня дасца ніяк.

Жыцьцё як рака, вясло у руках,
Плыві і шукай
У новы дзень кароткі шлях.

Ідзе за годам год,
Хоць і хочацца наадварот.

Забудзь пра бераг,
Зважай наперад –
На вір, на брод, на паварот.

Нас яднае агульная мара,
І дарозе ня бачна канца,
Мы усё, што ня зробіцца зараз,
Можам заўтра яшчэ раз пачаць.
Нашай веры ня знойдзецца меры,
І душа не шукае спакой.
Каб ня збочыць з дарогі уперад,
Я заўсёды плыву за табой.

Вясло ў руках, жыцьцё як рака,
Ў яе глыбіні
Паціху тонуць нашы дні.



Я жыву па-за словамі
Папулярнае мовы —
Зрэшты, справа ня новая,
Як і гэныя словы.
Я жыву, не сьпяшаюся,
Я жыву як умею,
Каб было ў чым пакаяцца,
Памыляюся ў меру.
І ад раньня да вечара,
Да гадзін ад імгненьняў
У памкненьні да вечнага...

...энтрапія, карацей кажучы.




Сьпякота зьверху, сьпякота зьнізу,
Навокал ліпень, а ў галаве
Талковай думкі няма паблізу,
А неталковых адна ці дзьве.

Сьпякота зьверху, сьпякота зьнізу,
Навокал ліпень і вольны дзень,
Цябе так звыкла няма паблізу,
Ды я і сам невядома дзе.

Душы няўтульна у арганізме,
А вочы прагна шукаюць цень,
З дарогі зьбіўся я не наўмысна —
Ці засынаю, ці звар'яцеў.

Ратуе розум адно імгненьне,
Калі на шчасьце ці на бяду
Твая усьмешка выходзіць з ценю,
І я нарэшце за ёй іду.



На вуліцы быў панядзелак,
Душа ж вымагала суботы,
А дні мітусьні не хацелі,
Марудна ішлі, неахвотна.

Было у жыцьці няутульна
Ад вечара, ночы і лета,
Пад раніцу думкі заснулі,
Аўторак прыйшоў непрыкметна.

Жыцьцё не па-роўнаму дзеліць —
То густа, то пуста, то сьмешна.
І што ў ім рабіў панядзелак?
Напэўна, усё перамешваў.

Хацелася слову парушыць маўчаньне,
Хацелася небу сачыць за узьлётам,
Хацелася скончыцца ўрэшце чаканьню.
Хацелася ведаць, адкуль ты і хто ты.

Вясна перастала здавацца вясною,
І зьдзіўлены позірк блукаў паміж снамі,
А заўтра было недзе там, за табою,
А сёньня было недзе тут, перад намі.

Твой дзень, панядзелак, спыніўся у часе,
Што так не бывае, ніхто не заўважыў.
Каб неяк пазьбегнуць памылак уласных,
Пытаньні зьнікаюць у нетрах адказаў.

Але панядзелак былыя надзеі
На «ёсьць» і «няма» беззваротна падзеліць,
Хоць кожны па-свойму, але разумеем —
Заўсёды бывае ня так, як хацелі.

Хацелася слову паслухаць маўчаньне,
Хацелася небу пасьпець за узьлётам,
Хацелася крочыць за межы чаканьня.
Хацелася ведаць, ці будзе субота.



Я стаміўся з табой сябраваць,
Выбачацца, чакаць, дараваць,
Разумець, адкладаць, пераносіць...
Да таго ж пачынаецца восень —
Незваротна зьнікае цяпло.
Падуладны яго недахопу,
Паступова марнее мой клопат
Дбаць пра тое, чаго не было.



Я паўсюль шукаў нагоды, каб натрапіць на прыгоды,
Адкладаў на потым справы і пра заўтрае ня дбаў,
Марыў зробіцца вядомым і, калі выходзіў з дому,
Ад пачатку па парадку словы простыя сьпяваў:

Сонца ўстала, сонца села, птушкі ў вырай паляцелі,
Бо ня любяць птушкі восень, гэтаксама, як і я.
Я па-свойму адлятаю, хоць і крыльля не хапае –
Зьнізу доля, ўверсе воля – вабіць тым, што нічыя.

Сонца грэе, сонца сьвеціць, разганяе хмары вецер,
Падаецца, што ўдаецца спадзяваньне апраўдаць.
Сёньня, заўтра і учора у хвілінах непаўторных
Так і жыў бы, толькі нешта пачынае халадаць.

Сонца сьвеціць, ды ня грэе, не збываюцца надзеі,
Можа, марыў не пра тое, ці ня гэтага жадаў,
Але ўсё яно часова і міне, няма размовы,
Толькі ж хочацца пры гэтым не згубіцца у гадах.



Ты пафарбавала маё неба
У колеры надзеі і чаканьня,
Стала невядомае патрэбным,
Згінулі адказы на пытаньні.

Навучыўся быць бязважкім вечар,
Каб дадаць спакою у размову...
Восень падыходзіць непрыкметна,
Ды нашто на восень траціць словы?
+
Раніца, як можа, грэе вецер,
Абуджае сподзеў мар наіўных.
Час вядзе у восень непрыкметна.
Я ж хачу, каб ён спыніўся ў жніўні.



У маім неналаджаным побыце
Не працуе званок на дзьвярах,
Не хапае ўсьмешак і позіркаў,
Асабліва па вечарах.

Тут далёкія ад дасканаласьці
Ходзяць думкі за межы кута,
І усё, што ў іх адбіваецца,
Разумецца неяк ня так.

Тут па-свойму утульна і хораша,
Можа, ў нечым ня горш, чым ва ўсіх,
Хоць часамі і іншага хочацца –
Можа, ў госьці цябе запрасіць?

Цішыня бяздоннай вышыні.
Думкам не знайсьці належных словаў.
Позіркаў шчасьлівых прамяні
Зблытваюцца ў новую размову.

Вось ужо і межаў не відно –
Дзьве душы з'яднаныя палётам.
Ёсьць каханьне, на дваіх адно,
Што пасьля – пакуль што не істотна.

Я хачу падараваць табе сьвітанак,
З цёплых промняў сонечных сатканы.
Пад усьмешку з пахам ранішняе кавы
Паўтараць тваё імя, як заклінаньне.

І ляцець туды, дзе зоры нас чакаюць,
Не зважаючы на хмары, дождж і вецер,
І адчуць, як разгараецца каханьне
З разуменьня, што ты проста ёсьць на сьвеце.

Раскажы пра сёлетнія сны,
Як яны сабой зьдзяйсьняюць мроі,
Калі раптам хочацца вясны,
Лістапад становіцца вясною.

І далей ужо і ты, і я
Аддаем сябе на волю часу.
Не істотна дзе, калі і як,
Важна толькі, каб заўсёды разам.



1. Як разумееш ты, што я хачу сказаць,
Тады навошта нам наогул словы —
Няхай у думках адбываецца размова,
Няхай у позірках адказы прагучаць.

2. Глядзіць пытаньне на цябе з маіх вачэй,
Ты робіш выгляд кшталту: «Што? Ня чую!»
Я так і ведаў, што з табой не засумуеш...
Усё ж са словамі, здаецца мне, прасьцей.



Ня пройдзе шлях Ваш там, дзе зараз я
Свае сьляды да выхаду рыхтую,
Дзе галава сьсівелая мая
Спакою яшчэ доўга не адчуе.

І будзе дом Ваш заўтра на зямлі,
Якую абмінае бездарожжа,
І не са мной Вам сподзевы дзяліць —
Я ўмею толькі складваць альбо множыць.

І будзе лета сілу набіраць,
На драбязу увагі не зьвяртаючы,
Каб зьнікнуць у зімовых вечарах
І жыць там, больш нікуды не зьнікаючы.



Галава на плячы

Перайдзі мой сон уздоўж,
А пасьля перайдзі яго ўпоперак,
Не пакінь, як удасца, сьлядоў
Па-за межамі новага сна.
Калі зможаш пасьпець да відна,
Забяжы на хвілінку ізноў,
Каб пабачыць, як робяцца попелам
Рэшткі колішніх сноў.



Фарбуюць вочы ночы цішыню,
Сон не дае жаданага спакою,
Бо, як заўсёды, я ня тое сьню,
Каб апасьля і думаць не пра тое.

Сівее золак звыклага жыцьця,
І вочы раньня на мяжы з усьмешкай,
Напэўна, спадзяюцца на працяг...
Ну, карацей, звані, калі прачнешся :)




Паводле "Los Bilbilicos"
Psalteria

Вакол сьпяваюць салаўі,
Каханьнем поўняць слых.
Празрыстых гукаў чысьціні
Нам хопіць на дваіх.

І кветкі, тоячы уздых,
Цьвітуць табе і мне,
Але пакуль належыш ты
Далёкай старане.

Жыцьцё заблытала шляхі
Вясноваю парой,
Ды веру я — з краёў чужых
Прыедзеш ты за мной.



Я казаў табе тысячу слоў
Самых розных, вясёлых і сумных.
Час разгублена ўперад ішоў,
Дні зьнікалі бяз лішняга шуму.
Скіраваўшы свой позірк назад,
Я міжволі ўпадаю у скруху,
Бо ні разу табе не сказаў
Аднаго — што люблю цябе слухаць.



Кульгавая мара складае гадзіны з імгненьняў пустых.
Зірнуўшы навокал, я трохі шкадую, што побач ня ты.

Паводле «А напоследок я скажу»
Б. Ахмадулінай

Апошніх словаў марны шэпт:
Бывай, кахаць ужо ня трэба.
Зьнікае сьвет,
За ім усьлед
і цемру забірае неба.
Як ты кахаў?
Ты наклікаў
няіснае
На нашы мары.
Ты так кахаў,
Як уцякаў,
Хаця цябе я не трымала.

Апошніх словаў марны шэпт...

Пачуцьцям думак не стае,
Пяшчотны сэнс згубілі рукі,
Цябе ня бачаць сны мае,
Зьнікаюць пахі, моўкнуць гукі.

Апошніх словаў марны шэпт:
Бывай, кахаць ужо ня трэба.
Зьнікае сьвет,
За ім усьлед
і цемру забірае неба.

Апошніх словаў марны шэпт...



У цішы старой дубровы я сустрэўся з іншым днём,
Зьнікаў яго пачатак там, дзе абрываўся сон.
І ляжала ценем памяць на ўсіх маіх шляхах,
Але запелі птушкі, каб ішоў цябе шукаць.

Твой цень казаў маім вачам, што трэба не зьдзіўляцца,
Калі зязюля раптам замаўчыць.
Яна, з нажытых мной гадоў пакінуўшы сямнаццаць,
Усе, што будуць апасьля, дазволіць не лічыць.

У цішы старой капліцы чую я, як ты маўчыш,
Як не куе зязюля і хвіліна не ляціць,
Як забыўся звыклы клопат даганяць мае сьляды,
Як цень тваёй усьмешкі зноў хавае мой уздых.

За імгненьне да каханьня цень спыніўся на мяжы,
Каб нагадаць мінуламу, дзе сьлед яго ляжыць.
Ад чаканьня да памкненьня крок дарогу перайшоў,
І я адчуў, як розум мой яднаецца з душой.

Там, дзе калісьці было каханьне,
Мой шлях працягу знайсьці ня змог,
У неадольны палон пытаньняў
Жыцьцё вяртала з любых дарог.
Па-за гадамі, па-за шляхамі
Старыя думкі на новы лад,
Каго шукаюць, каго чакаюць
І не пускаюць ісьці назад.

Не за гарамі, не за марамі
Хавае памяць мінулы дзень.
Усё былое заўсёды з намі,
На пару з ценем усьлед ідзе.
Па-за гадамі, па-за шляхамі
Старыя думкі на новы лад.
Каго шукаюць, каго чакаюць
І не пускаюць ісьці назад.

Нам не хапае утульных казак
У звыклай плыні бягучых дзён,
Замест пытаньняў адны адказы,
А рэшткі мрояў хавае сон.
Па-за гадамі, па-за шляхамі
Старыя думкі на новы лад.
Каго шукаюць, каго чакаюць
І не пускаюць ісьці назад.



Жыцьцё нам дорыць байкі з казкамі,
Жыцьцё нам не сябе паказвае.

Жыцьцё нас зводзіць у кампаніі,
Жыцьцё разводзіць нас з каханымі,
Жыцьцё хаваецца за казкамі
І не усім сябе паказвае.

Па-за жыцьцём памкненьні множацца,
Іх просты сэнс належыць кожнаму,
Але звычайна недасяжны,
Бо не усім сябе пакажа.

Ты па жыцьці ідзеш шукаючы,
Па-за жыцьцём ты усьміхаешся.



P.C.

Было ня так учора на зямлі —
Другія кветкі у другіх букетах,
Шляхі ня тыя не туды вялі,
Мы думалі ня тое не пра гэта.

Уражвала і цешыла жыццё,
Здавалася — яно ня мае краю,
Галоўная сустрэча з небыццём
Яшчэ далёка, і ня нас чакае.

Але ня роўны маюць людзі лёс,
Бог бачыць самых лепшых адмыслова,
Бывае, што яны у бок нябёс
Сыходзяць часам несвоечасова.

Мінае час, і нашыя гады
Так непазьбежна колькасьць набіраюць,
А хтосьці, назаўсёды малады,
З нязнаных даляў моўчкі пазірае.

Паводле «Тёмная ноч»
В. Агатава

Шлях да цябе па дарогах паўсюднай вайны,
Дзе ня там пачынаюцца дні ў разбураных лёсах.
Шлях да цябе пад наглядам сівой цішыні
Па кварталах пустых горадоў, па ваколіцах вёсак.

Цемрай начной кулі сьлепа шукаюць людзей,
Працінаючы вецер і дождж, як пасланцы нябыту.
Цемрай начной мроі робяць нічым далячынь,
Абяцаюць сустрэчу з табой і ня могуць ня збыцца.

Хочацца мне у пяшчотных вачах патануць,
Лёс свой знайсьці, зазірнуўшы ў іх глыбіні,
Веру, што ты дапаможаш адолець вайну
І пакуль гэта вера са мной я жыцця не пакіну.

Я на шляху - я ня збочу, я не павярну,
Шлях да цябе - выхад мой з небыцьця адзіны.
Веру, што ты дапаможаш адолець вайну
І пакуль гэта вера са мной я жыцьця не пакіну.

Казалі нам з усіх бакоў
- Глядзіце - вас ня стала,
А мы сьпявалі пра любоў
Да бульбы і да сала.
Кавалак лепшы для гасьцей,
Прынамсі, кожны меў,
Але ж, каб столькі іх было
Наўрадці хто хацеў.

Тут многа нас такіх,
Але ня кажам мы услых,
Як многа нас такіх.

Тым, хто казаў, што нас няма,
Мы не маглі паверыць,
А хто ж тады іх сустракаў
І адчыняў ім дзьверы?
Хто, іх пускаў на свой парог
І частаваў як мог?
Хто ім на карак апасля
Узьлезці дапамог.

Тутэйшы чалавек,
Адвеку тут і тут навек
Тутэйшы чалавек.

Пакуль сюды буслы лятуць
Былі і ёсьць, і будуць
Заўсёды тут - мой родны кут -
Палі, лясы і людзі.
І што б там хто ні гаварыў,
Мы тутака ўвесь час.
І не настане той пары,
Калі ня будзе нас.

На крок мы наблізілі неба,
Знайшоўшы сябе ў жыцьці,
Каб незразумелым суседзям
Спакойна грахі адпусьціць.
Даніну цярпеньню сплаціўшы,
Пазбыцца няпэўных надзей,
Каб холад цяплей перажыўся,
На ганак выходзіць радзей.

Утульнае пекла ілюзій
Шануе прасторы свае,
І людзі, нібыта, як людзі –
Чагосьці усім не стае.
Для шчасьця ня трэба нагоды,
А толькі пачатак і час,
Паціху выходзячы з моды,
Яно не сумуе бяз нас.

Ратуе усьмешка спагады
Ад марнай дарогі назад.
Бязьлітасны смак лістапада
Плыве паўз натомлены сад.
Дзе яблыкі адбранзавелі,
Галіны згубілі лісты.
У сьвет нечаканых завеяў
Ня хочаш, а трэба ісьці.

Нам зорак не відно за сівізною хмараў,
Вечар прытуліўся да зямлі,
І мокрай птушкі сьлед закрэсьліў успамін
Каб мару з непагодай падзяліць.

Заўтра у сонечным сьвятле
Зьдзіўленьне будзе ведаць новы шлях,
І варта захацець трымацца надалей
Кірунку, што адкрыецца пасьля.

І варта захацець ніяк не заўважаць
Марныя дарожныя слупы,
А калі раптам дзе сустрэнецца мяжа,
Спакойна за яе пераступіць.

Ці ж зоры не гараць за таўшчынёю хмараў,
Што вечар нахіляюць да зямлі,
За цёмнае вакно я доўга пазіраў
Праз сон, што неба з птушкай падзяліў.

Заўтра, у сонечным сьвятле
Зьдзіўленьне знойдзе новае жытло.
І іншае жыцьцё пакажа нам далей,
Як мара ставіць птушку на крыло.





Канстанцін Прэслаўскі (IX—X в.)
ПРОГЛАС ДА ЭВАНГЕЛЬЛЯ

Да сьвятога Эвангельля тут прадмова:
Згодна з даўнім абяцаньнем ад прарокаў,
Што Хрыстос ідзе да нас зьбіраць народы,
Асьвятляючы Сабой увесь Сусьвет,
Прыпадае на наш век Яго сустрэча.

І сьляпыя неўзабаве будуць бачыць,
І глухія слова кніжнае пачуюць.
Ў гэтым сьвеце мусіць Бога ведаць кожны.
І таму кажу я – слухайце, славяне –
Гэты дар усім належыць з Божай ласкі.



Дар Божы тым, хто прагне толькі праўды,
Дар Божы тым, чыя душа ня згіне,
І у якой заўжды жыве ўдзячнасьць.
І гэта Марк, Лукаш, Мацьвей і Ян
Казалі ўсім краям і іх народам:

Хто душу яднае з прыгажосьцю,
Хто ўмее шчырым сэрцам усьміхнуцца,
Каб абмінуць і грэх, і цемрашальства,
Ды каб паўстаць над паўсядзённым сьмецьцем,
І каб ісьці у райскія прасторы,

Каб з агнём, што нішчыць грэшных, не сустрэцца,
Каб на мудрасьць кіраваць уласны розум,
Гэта слова для цябе, народ славянскі,
Богам дадзена на ўсе твае часы,
Гадаваць спакой у сьветлых душах.



Уладарыць слова розумам і сэрцам,
І вядзе яно да спасьціжэньня Бога.
Як няможна быць у радасьці бяз сьвету,
Што дае магчымасьць кожнаму пабачыць
Дасканаласьць, створаную Богам,

Так душа, што ў словы літар не складала,
Не спасьцігне сэнсу Божага закона,
Што у Запавеце захаваны
І вароты Раю адчыняе.
Так і той, хто грома не пачуе,

Як пакорліва паўстане перад Богам?
Не адчуўшы водар той, што маюць кветкі,
Як аддасьць належнае зьдзіўленьню?
Калі вусны не ўспрымаюць болей слодыч,
Вельмі проста з камянём зраўняцца.



Так душы няўтульна непісьменнай,
Бо жыццё яна ня дорыць целу,
Бессэнсоўным толькі поўніць існаваньнем.
Мы ж гатовыя прыйсьці на дапамогу
Тым, хто хоча у жыцьці сваім пазьбегнуць

Разьвіцьця свайго грахоўнага пачатку.
Бо калі пачуе розум непісьменны
Слова Божае, нібы чужую мову,
Толькі звон спазнае ён, і больш нічога.
Вам усім навука ад Сьвятога Паўла:

Перш за ўсё, калі узносіцца малітва,
Дастаткова колькі словаў, каб данесьці
Зьнічкі сэнсу ў невыказныя вышыні,
А ня ў безьлічы выслоўяў адмысловых
Пажаданае згубіць паразуменьне.



І таму, хто не за мудрасьцю імкнецца,
Не знайсьці у сьвеце ясны накірунак,
Не спасьцігшы моцы праведнага слова,
А ягоныя здабыткі – тло і попел –
Не ўратуюць у апошнюю хвіліну.

Прагне цела кожны дзень здаровай ежы,
А душа ня можа жыць, як не пачуе
Слова Божага з надзённым запаветам,
Каб схаваць яго у сэрца трапяткое.
Дык паслухайце ж яшчэ адну навуку:

Хто расьце ў бязьмежжы Боскага Закона
І другім жыцьця падобнага жадае,
Добра ведае адвечнай праўды сутнасьць –
Тое зерне, што патрапіла ў глебу,
Атрымаць павінна дождж. Таксама ж сэрца:



Божых літараў дажджы яно прымае.
І прыходзяць яму словы ураджаем,
Каб у прыпавесьці іх складаць і кнігі,
Без якіх народ жыве у цемры.
Самы моцны голас хто пачуе,

Нават калі ён у розных мовах? Прагучыць
Ён не мацней мінулага імгненьня,
І толькі ў кнізе атрымае сілу.
Краіна без пісьменства – не краіна,
Народ, які ня мае кнігі, – не народ.

Як бяз зброі будзе войска несапраўдным,
Так і душа неабазнаная слабая
Ня знойдзе спосаб ратавацца ад праклёну,
А калі кляты вораг ужо блізка,
І ў бойцы лютай трэба толькі перамога,



Хай розум прыадчыніць тыя дзьверы,
Якімі ў душы вашы прыйдзе зброя,
Каваная з непераможных літар,
Каб змусіць д'ябла разьвітацца з галавою.
Апорай быць спасьцігламу пісьменства.

А праз Хрыста засвоеная мудрасьць
Асьвеціць розум і душу ўмацуе.
І будзе з вамі слова перамогі –
Апосталы сьвятыя і прарокі
Яго трымаюць ворагу на згубу.

Ахвяруйце ж перамогу гэту Богу,
Уздымайцеся над тленам і зьнішчэньнем,
Згіне грэх, нібыта сон чароўным раньнем.
І упэўнена устаньце перад Панам,
Каб бяз сораму глядзець Яму у вочы.



Праваруч вам быць пры Божым троне,
Калі будзе Ён судзіць усе народы.
І з анёламі у радасьці спрадвечнай
Вечнай літасьці Яго хвалу ўзьнесьці
Словам кніжным, прасьпяваным шчырым сэрцам.

У бязьмежжы чалавекалюбства
Апявайце веліч Божай славы:
Гонар і хвала Айцу і Сыну,
Паяднаным у Вялікай Тройцы
Са Святым і Ўсюдыісным Духам,
Ад усіх, на вечныя вякі.

Амін.